# КАНЦЭПТУАЛЬНАСЦЬ ЖАНОЧЫХ ВОБРАЗАЎ І НАРАТЫЎНЫЯ АДМЕТНАСЦІ РАМАНАЎ І. ШАМЯКІНА «ВАЗЬМУ ТВОЙ БОЛЬ» І І. ПТАШНІКАВА «АЛІМПІЯДА»

**В. А. Буднік**

*Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна,*
*бул. Касманаўтаў, 21, 224016, Брэст, Беларусь, budnik84@bk.ru,*
*Навуковы кіраўнік: Мельнікава З. П.,*
*прафесар кафедры беларускай філалогіі, прафесар, доктар філалагічных навук*

Артыкул прысвечаны аналізу жаночых вобразаў і наратыўных адметнасцяў раманаў вядомых беларускіх пісьменнікаў Івана Шамякіна «Вазьму товй боль» і Івана Пташнікава «Алімпіяда». Выяўлена, што глыбокаму пранікненню ў псіхалогію галоўных гераінь названых раманаў садзейнічае выкарыстанне разнастайных прыёмаў кампазіцыйнага і моўна-стылявога выяўлення. Істотнае значэнне для развіцця аўтарскай канцэпцыі абодвух пісьменнікаў мае суаднясенне ў аповедзе розных часавых пластоў, спалучэнне сюжэтна-падзейнага апісання з самараскрыццём гераінь праз асацыятыўную разгорнутасць іх роздумаў і ўспамінаў.

***Ключавыя словы***: Іван Шамякін; Іван Пташнікаў; раман «Вазьму твой боль»; раман «Алімпіяда»; жаночыя вобразы; наратыўныя адметнасці.

Мастацкае ўвасабленне жанчыны, асэнсаванне яе ролі ў сацыяльна-гістарычным лёсе грамадства хвалявала пісьменнікаў ва ўсе часы. Асоба жанчыны на працягу стагоддзяў натхняла таленавітых аўтараў, бо гэта вечная і невычарпальная тэма. Жаночыя персанажы ў мастацкай літаратуры нярэдка выступаюць сэнсава ёмістымі

канцэптамі. Вобраз жанчыны – адзін з самых распаўсюджаных у літаратуры.

Даследаванне канцэпцыі асобы жанчыны ў рамане І. Пташнікава «Алімпіяда», як і ў рамане «Вазьму твой боль» І. Шамякіна, дае магчымасць па-новаму асэнсаваць важныя аксіялагічныя аспекты тыпалогіі жаночых характараў, суаднесці іх індывідуальна-аўтарскую спецыфіку.

Пісьменнікі І. Шамякін і І. Пташнікаў, стваральнікі раманаў, што мы даследуем, паказалі няпросты шлях і жыццёвы выбар гераінь-жанчын, якія годна выконваюць сваю місію на зямлі, з якой непарыўна звязана іх паўсядзённая праца, годнасць і сумленне.

Адметнае месца ў шэрагу выдатных узораў нацыянальнай беларускай прозы, дзе створаны высокамастацкі вобраз маці-працаўніцы, ахавальніцы жыцця, займае раман І. Пташнікава «Алімпіяда» (1984). Пісьменнік рэалістычна, псіхалагічна-дакладна ўзнаўляе напружанае, бязмерна цяжкае жыццё беларускай калгаснай вёскі 60-х гадоў XX стагоддзя, а таксама прадстаўляе шэраг запамінальных і пераканаўчых жаночых вобразаў.

На высокім ідэйна-мастацкім узроўні ствараецца вобраз галоўнай гераіні твора – Алімпіяды Падаляк. Гэта пташнікаўская гераіня стала важным вобразам-канцэптам, які дапаўняе архетып жанчыны і маці ў беларускай літаратуры другой паловы XX ст. Яна – ратавальніца, ахоўніца жыцця і нястомная працаўніца. Аўтар засяроджвае ўвагу на духоўным свеце гераіні, на яе прыроджанай душэўнай мудрасці, на ўменні прымірыцца з абставінамі і застацца годнай.

Вобраз Алімпіяды арганізуе сюжэтныя падзеі і ўсю вобразную сістэму ў творы, у ім у вялікай ступені ўвасоблена аўтарская задума і выяўлены адносіны пісьменніка да сацыяльна-грамадскага жыцця, да навакольнага свету.

Пры стварэнні вобраза жанчыны-маці І. Пташнікаў абапіраўся на аўтабіяграфічны вопыт. Вядома, што ў рамане «Алімпіяда» пісьменнік увасобіў лёс роднай матулі, якой у той час ужо не было. На сустрэчах з чытачамі І. Пташнікаў успамінаў, як у час вайны ў 1943-м годзе маці

на тры дні знікла з дому. Даведаўшыся, што ў далёкай вёсцы, больш за трыццаць кіламетраў ад дому, гінуць каровы, яна, тады яшчэ зусім маладая жанчына, прайшла семдзесят кіламетраў, каб набыць карову і ў ваеннае ліхалецце пракарміць сваіх дзяцей. Два дні крок за крокам, упрошваючы, падштурхоўваючы, плачучы, праклінаючы і спадзеючыся, яна вяла карміцельку дадому. Дасягнуўшы мэты, дайшоўшы да пагорка роднай вёскі, маці і карова знясілена ўпалі пад красавіцкім сонцам. Гэтыя ўспаміны пісьменніка аб трывучасці роднай матулі дапамагаюць выявіць яго творчую пазіцыю. У асаблівай увазе І. Пташнікава да жанчыны-працаўніцы, сціплай, спакойнай, цярплівай, чулай, бачыцца сцвярджэнне жыццятвортнага пачатку ў лёсе беларускі.

Рэцыпіент разам з аўтарам захапляюцца лёсам галоўнай гераіні рамана «Алімпіяда». Асноўныя сюжэтныя падзеі твора адбываюцца ў беларускай вёсцы ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі. Аднак вайна ўсё яшчэ жыве ў памяці і свядомасці герояў, людзей старэйшага пакалення. Пасталенне галоўнай гераіні Алімпіяды адбывалася менавіта ў драматычны ваенны і пасляваенны час. Яна згадвае кароткае шчасце маладога сямейнага жыцця, нараджэнне сына Міфодзі і дачкі Тані, заўчасную смерць мужа Мікалая. Усё яе жыццё – цяжкая, непасільная праца ў калгасе, на ферме.

Алімпіяда вельмі часта ў думках звяртаецца да мінулага. Праз увесь раман рэтраспектыўным планам праходзіць яе жыццё. Ствараючы вобраз Алімпіяды, аўтар засяроджваецца на самым важным, галоўным, тым, што вызначае мэту і сэнс існавання чалавека на свеце. Даваеннае жыццё паказана сцісла, трывогі ваеннага часу – праз нешматлікія, але памятныя драматычныя эпізоды, праз намаганні ўратаваць параненых чырвонаармейцаў.

Алімпіяда яшчэ з даваеннага часу, з 1938-га года, працуе на ферме пасля заканчэння шасцімесячных курсаў заатэхнікума. Без фермы, без сваіх каровак яна не ўяўляе штодзённае жыццё. У гераіні ўжо няма сіл, але кінуць працу яна не можа: «Ужо б кінула… і не кідаецца ніяк… Устанеш і ідзеш…» [4, с. 25]. З фермай і клопатам пра жывёлу ўжо многа год звязана яе жыццё, і для яе – гэта

вельмі важнае і сапраўды асабістае. Пісьменнік падкрэслівае, што менавіта ў штодзённай працы гераіні заключаны глыбокі сацыяльны і маральны сэнс яе жыцця. Алімпіяда з маленства і маладосці выхавана ў працы, ва ўзаемаадносінах з іншымі людзьмі, якія і ацэньваюць годнасць і маральнае аблічча чалавека найперш за сумленныя і адказныя адносіны да працы.

Нельга не пагадзіцца з меркаваннем С. А. Андраюка, што вобраз Алімпіяды Падаляк у найбольшай меры раскрывае аўтарскае стаўленне да жыцця, «выпраменьвае тое маральнае цяпло, якім сагрэта ўся эмацыянальная атмасфера ў рамане» [1, с. 434]. Ідэйнай задумай аўтара прадвызначана, што гераіня выступае скразным вобразам, які звязвае мінулае і сучаснасць, а яе адносіны да іншых герояў абумоўліваюць аўтарскую маральна-этычную ацэнку апошніх. Так, «калі іншыя вобразы пададзены ва ўсёй іх складанасці і супярэчнасці, з падкрэсліваннем, магчыма, дзесьці і свядомым, негатыўных момантаў у іх паводзінах, узаемадачыннях, учынках, а найбольш у выказваннях, то Алімпіяда пазбаўлена гэтага поўнасцю. У ёй засяроджаны ў асабліва сканцэнтраваным выглядзе і ў форме надзвычай чыстай і непасрэднай духоўныя якасці, уласцівыя характару народнаму ў яго ідэальным увасабленні» [1, с. 468]. Несумненна, што аўтабіяграфічная аснова абумовіла ідэалізацыю вобраза Алімпіяды, працаўніцы і маці, гэта заканамерная псіхалагічная з’ява. Думаецца, пісьменнік мэтанакіравана звяртаецца да гэтай эстэтычнай стратэгіі, якая дазваляе засяродзіць увагу на маральным змесце падзей і абліччаў іншых герояў.

У вобліку гэтай гераіні ў асабліва сканцэнтраваным выглядзе сабраны лепшыя маральныя і духоўныя якасці, уласцівыя беларускаму жаночаму характару. На прыкладзе Алімпіяды аўтар стварыў вобраз самаахвярнай жанчыны, абмалёўваючы яе ў паўсядзённай нястомнасці, у сямейных адносінах, прадставіўшы беларуску ў сапраўднай духоўнай годнасці і маральнай прывабнасці. У вобразе Алімпіяды ўвасоблены архетыпавы для беларускай сацыякультурнай прасторы тып маці-сялянкі.

Сучаснасць і вайна, катэгорыя памяці, праблема злачынства і даравання перапляліся і ў рамане І. Шамякіна

«Вазьму твой боль» (1978), у якім пісьменнік вялікую ролю адводзіць паказу духоўнай эвалюцыі жанчыны.

У цэнтры ўвагі пісьменніка галоўны герой – Іван Батрак, шчаслівы і гарманічны свет якога рушыцца, калі герой адчувае, што будучага няма, пакуль побач раптам ажывае жахлівае ваеннае мінулае ў асобе здрадніка-забойцы Шышковіча. Батрак вельмі падрабязна распавядае жонцы Таісе пра свой самы вялікі боль – знішчэнне паліцаямі і карнікамі яго роднай сям'і. Як слушна заўважыла даследчыца Т. Шамякіна, успамін Івана пра трагедыю, якая здарылася ў маленстве, яго падрабязны аповед самаму блізкаму чалавеку – жонцы – «як ачышчэнне ад граху, скідванне з душы ўсёй жыццёвай драбязы, што непазбежна нарастае за гады» [6]. Тася – медык, служыць самай гуманнай справе на зямлі, ратуе людзей ад хвароб і болю. Бачачы намер Шышкі загубіць жонку, Таіса, ратуючы старую жанчыну, міжволі забівае здрадніка.

Хоць у цэнтры аповеду галоўны герой Іван Батрак, аднак вялікае значэнне мае вобраз яго жонкі, якая, здзейсніўшы рашучы ўчынак, бярэ на сябе боль любага мужа, іншых людзей. Ахвяруючы сваёй свабодай, жанчына вырашае драматычную праблему, якая здавалася невырашальнай.

З гераіняй рамана «Вазьму твой боль» Таісай пачынаецца знаёмства з другога раздзела твора. І. Шамякін у паказе гераіні, як і І. Пташнікаў, ужывае рэтраспектыўны прыём, узнаўляе ўспаміны гераіні пра яе з'яўленне ў вёсцы Добранка, пра гісторыю іх з мужам кахання і сямейнага жыцця. Пісьменнік вельмі яскрава акрэслівае характар Тасі – летуценніцы нават у сталым узросце і ў той жа час асобы з цвёрдымі перакананнямі.

Яшчэ маладой асобай, Тася характарызуецца атэістычна-ваяўнічым светапоглядам. Будучы маладой жонкай, яна ўступае ў вайну супраць рэлігіі, супраць Бога з цёткай Івана, у хату якой прыйшла жыць. «Тася настойліва патрабавала, каб цётка зняла абразы, якіх было поўны кут – Ісус Хрыстос, матка боска, Іван-хрысціцель, Георгій Пабеданосец і яшчэ нейкія святыя. Сорамна ёй, акушэрцы, камсамолцы, жыць пад абразамі… Толькі праз многа гадоў,

як Хвядора памерла, Тасі, сталай ужо жанчыне, матцы дваіх дзяцей, на пахаванні, калі старую адпявалі яе набожныя сяброўкі, упершыню стала сорамна і прыкра за сваю юнацкую жорсткасць і бестактоўнасць, за іншыя крыўды, якія свядома ці несвядома, магчыма, зрабіла цётцы… у хвіліны жалобы развярэдзілі сэрца, і жанчына балюча перажывала, горка плакала над труной» [5, с. 23]. Смерць мудрай хрысціянкі стала для Тасі адной з прыступак да пакаяння і шляху да Бога. З часам жанчына пачала заўважаць, што яе душа не задавальняецца сямейна-побытавымі клопатамі, а прагне нечага большага. Аўтар адзначае, што Тасю стала наведваць «незразумелая туга па нечым невядомым. Хацелася чагосці асаблівага, а чаго – сама не знала. Зорак з неба, ці што? Палохалася часам Тася такога смутку, але знайшла яму тлумачэнне: узроставае гэта, пэўна, у многіх жанчын так здараецца, калі ім мінае сорак. Туга па маладосці, ці што? Ці зайздрасць маладым?» [5, с. 25] Пісьменнік выяўляе душэўную няўрымслівасць сваёй гераіні і адзначае, што з цягам часу Таіса Міхайлаўна пачынае разумець тое, што «яе палохала неасэнсаванае незразумелае адчуванне, што яна не паспела зрабіць, ці прапусціла ў жыцці нешта асаблівае, самае цікавае, незвычайнае і прыгожае» [5, с. 210]. Узіраючыся ў самую глыбіню душы жанчыны, І. Шамякін паказаў сум, моманты роздумнай меланхоліі гераіні, «уласцівыя многім людзям сярэдняга ўзросту» [2, с. 50]. Адыход Хвядоры, цеткі Івана, у іншы свет прымусіў Тасю ўспомніць тое, чаму вучыла яе «манашка» – так называлі цетку ў вёсцы. Калі жонка Батрака адчула рэальную небяспеку для сваёй сям'і, зразумела, што рушыцца тое, што здавалася такім трывалым, і гэта прымусіла яе звярнуцца да Бога. Як слушна заўважыла даследчыца А. Кавалюк, «духоўны свет жанчыны фарміраваўся пад моцным уздзеяннем савецкай антырэлігійнай прапаганды, якая дзесяцігоддзямі руйнавала ў свядомасці грамадзян хрысціянскія ідэалы. Аксіялагічны змест хрысціянства старанна прыніжаўся. Праблема веры і бязвер'я займае важнае месца ў рамане І. Шамякіна. Мастак слова выяўляецца як чалавек неабыякавы да духоўных праблем у грамадстве і свае аўтарскія ідэалы ён часам хавае ў падтэкст твора» [2, с. 50].

Для гераіні твора шчасце сям'і, душэўны спакой мужа аказваюцца даражэйшымі за ўласнае жыццё і свабоду. Гэтым ўчынкам Таісы аўтар паказвае сілу любові і духоўныя магчымасці чалавека, які па-сапраўднаму кахае. Адчай жанчыны, як і яе мужа Івана, абумоўлены тым, што былы паліцай Шышка жыве смела, з упэўненасцю, што за злачынствы ваеннага часу ён панёс ужо пакаранне і мінулае трэба забыць. Шышка настолькі спакойны, што купляе добры дом, дзе збіраецца жыць, спадзяецца, што яго злачынствы землякі ўжо забылі. Былы забойца піша скаргу ў пракуратуру на сведку яго злачынстваў, на Івана Батрака, што той пагражаў яму.

Маральна-псіхалагічную сутнасць канфлікту паміж мужам Таісы і былым паліцаем Шышковічам, праблему злачынства і даравання, складанасць выбару гераіні пісьменнік падымае да філасофскага ўзроўню.

У рамане І. Шамякіна «Вазьму твой боль», як і ў рамане І. Пташнікава «Алімпіяда», тэмы сучаснасці і вайны перакрыжоўваюцца і надаюць вострую канфліктнасць маральна-этычнай прасторы сваіх твораў. Абодва пісьменнікі пераканаўча даводзіць, што без ачышчэння горкай праўдай мінулага не будзе надзейнай будучыні.

Характэрнай асаблівасцю арганізацыі мастацкай структуры рамана І. Шамякіна «Вазьму твой боль» з'яўляецца не толькі сумяшчэнне ў ім розных часавых планаў, але і разнастайных нараталагічных стратэгій, праз якія раскрываецца адметнасць светабачання як самога аўтара, так і яго герояў. Функцыі героя-апавядальніка часта бяруць на сябе галоўныя героі твора. Дынамізм сюжэтнага развіцця з'яўляецца характэрнай асаблівасцю з большай ступені рамана І. Шамякіна, чым І. Пташнікава.

Абодва раманы вызначаюцца даволі складанай структурай, пры гэтым раман І. Шамякіна характарызуецца большай драматычнай напружанасцю сюжэтнага разгортвання, большым дынамізмам падзей. Але менавіта мастакоўская заглыбленасць ва ўнутраны свет гераінь – характэрная асаблівасць абодвух раманаў.

Трэба адзначыць, што рэтраспектыўныя эпізоды ў раманах – гэта не проста ўспаміны гераінямі мінулага

жыцця. У сваіх разважаннях, успамінах, сумненнях Алімпіяда з рамана І. Пташнікава і Таіса з рамана «Вазьму твой боль» І. Шамякіна вядуць сапраўдны дыялог з часам, імкнуцца асэнсаваць пройдзены жыццёвы шлях, ацаніць перажытае, засяроджана задумацца над сучасным і будучым. Для гэтых жанчын настаў вельмі адказны час падсумавання і маральнай ацэнкі пражытага. Для абедзвюх гераінь – гэта важная, патрэбная душэўная праца, скіраваная на тое, каб адчуваць, што ўсё было недарэмна, што зробленае, перажытае мела высокі сэнс.

Заўважана, што ў рамане «Вазьму твой боль» І. Шамякіна самыя розныя наратыўныя ўзроўні і сродкі стварэння вобразаў гарманічна суіснуюць і ўтвараюць цэласную мастацкую сістэму: востра драматычныя сцэны замяняюцца паказам хатніх спраў і вытворчых праблем, спрэчкі і дыялогі герояў – роздумам ці ўспамінам кагосьці з іх, аб’ектывізаванае апавяданне пісьменніка – усхваляваным маналогам героя. Пераплеценасць лёсаў герояў, залежнасць сучаснага ад мінулага абумовілі духоўна-маральную актуальнасць рамана «Вазьму твой боль». У гэтым творы І. Шамякін выдатна выяўляецца як майстар «падзейнага псіхалагізму». Пісьменнік часта перадае пачуцці герояў праз апісанне «знешняга», «фізічнага» – паводзіны, учынкі, мову, жэсты, гучанне голаса, сэнсу позіркаў.

Неабходна падкрэсліць, што І. Пташнікаў таксама спалучае розныя апавядальныя стратэгіі: стварае шматгеройны раман, але пры гэтым вылучае на першы план свет перажыванняў сялянкі-працаўніцы і жанчыны-маці. Праз псіхалагічна дакладную інтэрпрэтацыю рэчаіснасці, дзе дамінуе не столькі паказ падзей, колькі ўвага да духоўнага свету асобы, пісьменнік прэзентуе шырокаахопны малюнак беларускай калгаснай вёскі 60-х гадоў. І на першым плане – жанчыны, беларускія сялянкі, розныя па поглядах, характарах, сямейных гісторыях, але аб’яднаныя адной доляй. Штодзённай цяжкой працай яны адраджаюць, умацоўваюць жыццё на сваёй зямлі ў пасляваенныя дзесяцігоддзі. Гэты цяжкі абавязак адказнасці за сённяшні і заўтрашні дзень не толькі сваіх

дзяцей, але ўсіх людзей праносіць праз усё жыццё Алімпіяда.

Раманы беларускіх празаікаў І. Шамякіна і І. Пташнікава ў наратыўным плане ўяўляюць сабой складаную і разгорнутую структуру, з дапамогай якой раскрываецца дыялектыка ўзаемаадносінаў асобы і грамадства, глыбіню і складанасць унутранага свету чалавека. Глыбокаму пранікненню ў псіхалогію галоўных гераінь названых раманаў садзейнічае выкарыстанне разнастайных прыёмаў кампазіцыйнага і моўна-стылявога выяўлення. Істотнае значэнне для развіцця аўтарскай канцэпцыі абодвух пісьменнікаў мае суаднясенне ў аповедзе розных часавых пластоў, спалучэнне сюжэтна-падзейнага апісання з самараскрыццём гераінь праз асацыятыўную разгорнутасць іх роздумаў і ўспамінаў. Важную ролю адыгрывае дыялагічны характар самарэфлексіі гераінь, якія сведчыць пра іх напружаныя духоўныя пошукі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Андраюк С. Чалавек на зямлі. Нарыс творчасці Івана Пташнікава // А жыццё – вышэй за ўсё : выбранае : літ.-крыт. арт. ; нарыс творчасці / С. Андраюк ; прадм. А. Рагулі. Мінск, 1992. С. 267–490.

2. Кавалюк А.С. Проза Івана Шамякіна 70-х гадоў: жанрава-стылёвая спецыфіка, канкрэтна-гістарычны і аксіялагічны змест // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 3. Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія. № 2. 2019. С. 48–53.

2. Локун В. Іван Шамякін // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4-х т. Мінск, 2001. Т. 3.

3. Пташнікаў І. Збор твораў. У 4 т. Т.4 Раман. Мн.: Маст. літ., 1992.

4. Шамякін І. Вазьму твой боль : раман. Мінск : Маст. літ., 1982.

5. Шамякіна Т. Пасляслоўе да рамана “Вазьму твой боль” // [Электронны рэсурс]. 2018. Рэжым доступу: https://edudocs.net/2263987/

## ГЕРОЙ-АХВЯРА Ў ТВОРЧАСЦІ І. ШАМЯКІНА 1990-Х ГАДОЎ (НА ПРЫКЛАДЗЕ АПОВЕСЦЕЙ «БЕЗ ПАКАЯННЯ» І «ЗАВІХРЭННЕ»)

**К. В. Уніятава**

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны,*
*вул. Савецкая, 104, 246019, Гомель, Беларусь,*
*uniatowaekaterina@gmail.com,*
*Навуковы кіраўнік: Брадзіхіна А. В.,*
*дацэнт, кандыдат філалагічных навук*

У артыкуле на пракладзе аповесцяў «Без пакаяння» і «Завіхрэнне» народнага пісьменніка БССР Івана Шамякіна разглядаюцца вобразы герояў-ахвяраў. У першай пісьменнік выносіць прысуд тагачаснаму грамадска-палітычнаму ладу, адмаўляючы яму ў будучыні. Пісьменнік падкрэслівае, што грамадства 90-х гадоў XX стагоддзя, у якім назіраецца відавочнае падзенне маралі, аддалілася ад разумення каштоўнасці чалавечага жыцця. У другой аповесці героі становяцца ахвярамі абставін, «злачынцамі паняволі», але пісьменнік праз глыбокае раскрыццё філасофскіх праблем (пакарання, даравання, кахання, граху, волі, помсты, выбару) даводзіць выключную важнасць захавання чалавечага ў чалавеку, а таксама паказвае як стваральную, так і разбуральную моц стэрэатыпаў грамадства ў іх уздзеянні на асобу.

***Ключавыя словы***: Іван Шамякін; творчасць; аповесць «Без пакаяння»; аповесць «Завіхрэнне»; літаратурны герой.